76.1
Д71

Д69

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

УДК 002.2+655.4/.5] (476-25) "1795/1917"

**Доўнар Ларыса Іосіфаўна**

# РАЗВІЦЦЁ КНІГАВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў МІНСКУ (1795–1917): КНІГАЗНАЎЧЫ АСПЕКТ

05.25.03 – бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства
і кнігазнаўства

**Аўтарэферат**
**дысертацыі на суісканне навуковай ступені**
**кандыдата педагагічных навук**

Мінск 2005

76.173(Абел)

Праца выканана на кафедры гісторыі і тэорыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

Навуковы кіраўнік — доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, старшыня грамадскага аб'яднання "Міжнародная асацыяцыя беларусістаў", загадчык аддзела рэдакцыі газеты "Голас Радзімы" **Мальдзіс А.І.**

Афіцыйныя апаненты — доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі і методыкі пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка" **Буткевіч В.У.**

кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" **Паўлава С.А.**

Апаніруючая арганізацыя — Нацыянальная бібліятэка Беларусі

Абарона адбудзецца 21 красавіка 2005 г., у 14.00 гадзін, на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 09.03.01 пры ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" па адрасе: г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі.

Тэл. вучонага сакратара: 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".

Аўтарэферат разасланы 21 сакавіка 2005 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый кандыдат педагагічных навук, прафесар — Л.І.Казлоўская



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання**

Распрацоўка праблемы кнігавыдавецкай дзейнасці, якая з'яўляецца адным з важных фактараў развіцця культуры і адукацыі Беларусі і адлюстраваннем тых глыбінных працэсаў, што адбываюцца ў іх, дазваляе ўсебакова асэнсаваць ролю кнігі ў сацыяльных пераўтварэннях грамадства. Кніга і ў сучасным грамадстве працягвае заставацца пераважнай формай існавання і захавання культурнай спадчыны, пераемнасці інтэлектуальнага вопыту паміж пакаленнямі.

Кніга Беларусі, у дадзеным выпадку мінскія выданні, – своеасаблівы і унікальны прадукт культурнага і гістарычнага развіцця беларускай нацыі. Мінскую кніжную спадчыну складаюць выданні на розных мовах, асноўныя з якіх – беларуская, польская, руская, яўрэйская. У айчынным кнігазнаўстве вызначаная тэма не распрацавана.

Да гэтага часу ў распараджэнні беларускіх навукоўцаў – толькі разрозненыя звесткі і асобныя даследаванні, якія часткова асвятляюць некаторыя праблемы або аспекты кнігадрукавання ў Беларусі канца XVIII – пачатку XX стагоддзя. У кнігазнаўстве – працы Н. Ю. Бярозкінай, Г. Я. Галенчанкі, З. І. Збралевіч, Г. У. Кірэевай, Т. І. Рошчынай, Т. А. Самайлюк, Я. С. Умецкай; у літаратуразнаўстве – працы С. Х. Александровіча, Г. В. Кісялёва, А. І. Мальдзіса, У. І. Мархеля; у гістарычнай навуцы – працы С. А. Кузняевай, З. В. Шыбекі.

У працах польскіх вучоных (А. Кавецка-Грычова, М. Підлыпчак-Маяровіч) занатавана толькі кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску ордэна базыльянаў (канец XVIII ст.). Перыяд беларускага кнігадрукавання з 1795 г. па 1917 г. прадстаўлены асобнымі працамі С. Х. Александровіча, Н. Ю. Бярозкінай, Я. С. Умецкай. Некаторыя факты менавіта аб мінскім кнігавыданні 1795–1917 гг. утрымліваюцца ў даследаваннях Т. Зянкевіча, Я. Кушлейкі, М. Стольцман.

Разглядаемы перыяд – гэта час уваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Аднак рэгіянальнае кнігазнаўства, на ролю якога могуць прэтэндаваць і мінскія выданні 1795–1917 гг., у Расіі толькі пачало распрацоўвацца. Дзейнасць кнігавыдавецтваў на тэрыторыі Беларусі не разглядаецца і ў сучасных расійскіх навуковых і вучэбных выданнях па ўсеагульнай гісторыі кнігі (І. Я. Барэнбаўм, А. А. Говараў, Т. Г. Купрыянава, І. А. Шамракова). Больш ранція працы па кніжнай справе Беларусі вызначанага перыяду змяшчаюць фрагментарныя і павярхоўныя звесткі, для іх уласцівыя ўстарэлыя падыходы і погляды на кнігавыданне ў Беларусі. Пацвярджаецца думка І. І. Фраловай, якая неаднаразова выказвалася ў расійскім друку, аб тым, што даследаванне кніжнай справы пэўнага рэгіёна можа быць ажыццёўлена пры ўмове развіцця рэгіянальнага кнігазнаўства і толькі ў даследаваннях лакальнага ахопу.

Працы беларускіх, польскіх і расійскіх вучоных пацвярджаюць вострую неабходнасць шырокага развіцця лакальных кнігазнаўчых даследаванняў, як абагульняючых, так і ў межах прыватных тэм, без якіх нельга ўявіць усю паўнату укладу, зробленага мясцовымі выдаўцамі ў развіццё айчыннай культуры і асветы.

Рэгіянальныя і лакальныя даследаванні – найбольш перспектыўны кірунак на шляху стварэння поўнай карціны развіцця кніжнай справы і асэнсавання ролі кнігавыдання ў працэсе культурна-асветніцкага развіцця Беларусі. Актуальнасць даследавання кнігавыдавецкай справы ў Мінску, як і наогул у Беларусі, абумоўлена

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
ІНВ. №

неабходнасцю стварэння фундаментальнай гісторыі беларускай кнігі, дзе была б адлюстравана ўся разнамоўная кніжная прадукцыя.

Не менш важкай базай кнігазнаўчых даследаванняў з'яўляецца выдавецкі рэпертуар – адна з галоўных складаючых кнігавыдавецкай дзейнасці, даследаванне якога павінна папярэднічаць даследаванню мясцовага кнігавыдання. Праблема складання бібліяграфічных паказальнікаў нацыянальнай кніжнай прадукцыі застаецца ў Беларусі да канца нявырашанай. Патрабуе дапаўнення каталог “Кніга Беларусі, 1517–1917” (1986), у якім адлюстраваны рэпертуар выданняў толькі на рускай і беларускай мовах. У стадыі складання знаходзіцца і частка рэтраспектыўнай бібліяграфіі беларускіх выданняў лацінскім шрыфтам XVI–XIX стст. “Кніга Беларусі”, якой займаецца Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Паўната працы будзе залежаць ад дакладна арганізаванага ўліку мясцовай кніжнай прадукцыі з прыцягненнем вызначанага кола бібліятэк і іншых кнігазбораў, дзе такія выданні захоўваюцца. Вялікую значнасць набывае ўключэнне апісанняў збораў архіваў, у прыватнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. У сучасных умовах асаблівую актуальнасць маюць як выяўленне і ўлік, так і захаванне мясцовай кніжнай прадукцыі, якая набывае статус помнікаў мясцовай кніжнай культуры і на якую павінен распаўсюджвацца крытэрый рэдкасці незалежна ад года выдання.

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыя выканана ў межах праграмы факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў “Інфармацыйныя рэсурсы Рэспублікі Беларусь і іх кадравы патэнцыял” і праграмы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па стварэнні рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі “Кніга Беларусі” – “Беларускія выданні лацінскім шрыфтам XVI – XIX стст.”

**Мэта і задачы даследавання**

Аўтар ставіць сваёй мэтай вызначыць асноўныя фактары, тэндэнцыі і спецыфіку развіцця мінскага кнігавыдання ў кантэксце грамадска-культурнага жыцця горада.

Мэтавая ўстаноўка абумовіла неабходнасць вырашэння наступных задач:

1. Вызначыць тэрміналагічнае размежаванне паняццяў “кнігадрукаванне” і “кнігавыданне”.

2. Распрацаваць крытэрыі перыядызацыі мінскага кнігавыдання, вызначыць асноўныя этапы яго станаўлення і развіцця.

3. Вызначыць тыпы мінскіх кнігавыдавецтваў, прааналізаваць іх дзейнасць.

4. Устанавіць сувязі кнігавыдання Мінска з выдавецкімі цэнтрамі Расійскай імперыі, абгрунтаваць іх абумоўленасць.

5. Выявіць мінскія выданні, даць іх тыпалагічную характарыстыку (галінова-тэматычную, відавую, моўна-аўтарскую); скласці бібліяграфічны паказальнік, які стане крыніцазнаўчай базай, паслужыць кнігазнаўчым даследаванням.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

<u>Аб'ектам даследавання</u> з'яўляецца кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску 1795–1917 гадоў.

<u>Прадметам даследавання</u> выступае развіццё асноўных аб'ектаў і з'яў кнігавыдавецкай дзейнасці: кнігавыдавецтваў, кнігавыдавецкага рэпертуару і кнігавыдавецкіх сувязей, іх тыпізацыя.



**Гіпотэза даследавання**

Гіпотэзай дысертацыі з'яўляецца меркаванне аўтара, што кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску 1795–1917 гг. мела дынамічны характар, знаходзілася пад уплывам грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурна-асветніцкіх фактараў развіцця горада, служыла задавальненню патрэб мясцовай грамадскасці ў інфармацыі па розных галінах ведаў, садзейнічала адукацыі, культуры і навуцы, што пацвярджаецца галінова-тэматычным, відавым і моўна-аўтарскім складам рэпертуару кніжнай прадукцыі.

**Метадалогія і метады правядзення даследавання**

Для вырашэння пастаўленых задач быў выкарыстаны комплекс метадаў, якія ўзаемадапаўняюць адзін аднаго. Сярод іх агульналагічныя і агульнанавуковыя метады: аналізу і сінтэзу, рэканструкцыі, параўнальна-гістарычны, статыстычны, а таксама спецыяльныя кнігазнаўчыя метады: функцыянальны, аналітыка-тэматычны, структурна-тыпалагічны, бібліяграфічны.

Комплекснае вывучэнне аб'екта праводзілася на базе метадалогіі *сістэмна-тыпалагічнага і функцыянальнага* падыходаў, існуючых у рэгіянальным кнігазнаўстве. Важнае значэнне для вырашэння пастаўленых задач мелі працы ў галіне кнігазнаўства расійскіх і польскіх вучоных А. І. Барсука, І. Я. Барэнбаўма, А. А. Белавіцкай, Б. Бянькоўскай, К. Гламбіёўскага, А. А. Грачыхіна, М. Кацуёвай, Б. В. Ленскага, К. Міганя, А. С. Мыльнікава, А. В. Сакалова, І. І. Фраловай, В. І. Харламава, Г. М. Швяцовай-Водка, Д. А. Эльяшэвіча, а таксама працы па *гісторыі кнігавыдання*: беларускіх вучоных – С. Х. Александровіча, Н. Ю. Бярозкінай, А. І. Мальдзіса, Я. С. Умецкай; польскіх вучоных – С. Арцта, Т. Зянкевіча, Я. Кастэцкага, Я. Кушлейкі, М. Леха, М. Рулікоўскага, Я. Савінскага, Э. Сладкоўскай, М. Стольцман, В. Тамашэўскага, Р. Цыбульскага; расійскіх вучоных – А. В. Блюма, С. У. Бялова, Я. Л. Неміроўскага, І. І. Фраловай, І. А. Шамарокавай. Пры распрацоўцы і раскрыцці тэмы мы абапіраліся таксама на даследаванні беларускіх *педагогаў, літаратуразнаўцаў, гісторыкаў і філосафаў*: С. Х. Александровіча. М. В. Біча, Э. К. Дарашэвіча, М. К. Кірылава, Г. В. Кісялёва, М. І. Крукоўскага, С. А. Кузняевай, А. І. Мальдзіса, У. І. Мархеля, У. С. Пасэ, З. В. Шыбекі і іншых.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў**

Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў дысертацыі.

- Тэрміналагічна размежаваны паняцці “кнігадрукаванне” і “кнігавыданне”, што садзейнічала тыпізацыі мінскіх кнігавыдавецтваў. Такое размежаванне ў кнігазнаўчых даследаваннях раней не рабілася.
- Распрацаваны комплексны крытэрый перыядызацыі мінскага кнігавыдання, у склад якога ўвайшлі галоўны (гістарычны), асноўныя (сацыяльна-эканамічны, палітычны, культурна-асветніцкі) і спецыфічныя (кнігавыдавецкія) крытэрыі, што спрыяла выдзяленню і абгрунтаванню трох этапаў мінскага кнігавыдання: першы – 1795–1864, другі – 1865–1904, трэці – 1905–1917 гг.
- Вызначаны тыпы кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў Мінска 1795–1917 гг. па ўладальніцкай прымеце (прыватныя, грамадскія і дзяржаўныя), а таксама па галіновым і функцыянальным складзе кніжнай прадукцыі (універсальныя і спецыялізаваныя). Удакладнены гады дзейнасці больш за 20 выдавецкіх прадпрыемстваў, выяўлена новае выдавецтва “Культура” (1905–1906).
- Вылучаны міжрэгіянальны, культурны, камунікацыйны, колькасны і якасны ўзроўні кнігавыдавецкіх сувязей Мінска з Вільняй, Варшавай, Пецярбургам, якія

мелі свае адпаведныя тыпы ўзаемасувязей, што ў сваю чаргу было абумоўлена гісторыка-эканамічнымі і нацыянальна-культурнымі кантактамі.

- Вызначаны галінова-тэматычны, відавы, моўна-аўтарскі тыпалагічны склад і спецыфіка мінскіх кніжных выданняў, асноўным функцыянальным прызначэннем якіх было задавальненне патрэб грамадства ў галіне кіравання, адукацыі, навукі і культуры.
- У выніку навукова-бібліяграфічных пошукаў выяўлены і ўведзены ў навуковы ўжытак раней не ўлічаныя ў бібліяграфічных крыніцах і не вядомыя навукоўцам мінскія выданні: 273 – на рускай, 79 – на польскай, 65 – на яўрэйскай, восем – на лацінскай, сярод іх дзесяць мінскіх нотных выданняў Ф. Міладоўскага, А. Грунера, В. Пшыборы, якія былі залічаны да страчаных.

**Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў**

Практычная значнасць атрыманых вынікаў.

Вынікі даследавання паслужаць развіццю беларускага кнігазнаўства, могуць быць выкарыстаны пры стварэнні фундаментальнай працы па гісторыі кнігавыдання ў Беларусі; з'явяцца дапаўненнем курсаў "Гісторыя беларускай кнігі" і "Кнігазнаўства", якія выкладаюцца ў вышэйшых навучальных установах Беларусі. Бібліяграфічны паказальнік мінскіх выданняў, які ўключае 3125 найменняў, будзе важкім папаўненнем рэпертуару кнігі Беларусі, будзе садзейнічаць інфармацыйна-бібліяграфічнаму забеспячэнню гісторыі Беларусі і гістарычных навук.

Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе кафедры гісторыі і тэорыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, рэалізаваны ў практыку работы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па стварэнні рэтраспектыўнай бібліяграфіі "Кніга Беларусі" ("Беларускія выданні лацінскім шрыфтам XVI – XIX стст."), што пацвярджаецца адпаведнымі актамі.

Навуковыя палажэнні даследавання могуць стаць асновай для далейшых навуковых распрацовак у галіне беларускага кнігазнаўства.

Сацыяльна-эканамічная значнасць даследавання.

Вынікі даследавання скіраваны на адраджэнне і захаванне кніжнай спадчыны; папоўняць звесткі аб навукова-гістарычным, сацыяльна-эканамічным і культурна-асветніцкім развіцці горада, а таксама з'явяцца пэўным укладам у краязнаўчы рух. Значнасць даследавання заключаецца ў магчымасці эфектыўнага выкарыстання вучонымі, кнігазнаўцамі, бібліёграфамі і бібліятэкарамі, краязнаўцамі як ведаў пра кнігавыданне ў Мінску, так і бібліяграфічнага паказальніка мінскіх выданняў. Вынікі даследавання могуць быць карыснымі і сучасным выдаўцам у вывучэнні вопыту і традыцый іх папярэднікаў. Сацыяльна-эканамічная значнасць даследавання вызначаецца перспектывай распрацоўкі беларускай кнігазнаўчай адукацыі і скіравана на павышэнне эфектыўнасці і якасці выкладання кнігазнаўчых дысцыплін у вышэйшых навучальных установах Беларусі. Вынікі даследавання могуць укараняцца пры распрацоўцы новых вучэбных дапаможнікаў і праграм.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Тэрміналагічнае размежаванне паняццяў "кнігадрукаванне" і "кнігавыданне" выяўляецца на ўзроўнях тэарэтычных, метадычных і гістарычных ведаў аб кнігадрукаванні і рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці, вынікае з іх аб'ектна-прадметнай і функцыянальнай спецыфікі, абумоўлена практычнай дзейнасцю (паліграфічнай, выдавецкай).



2. Кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску ў перыяд 1795–1917 гг. уяўляла дынамічны працэс, у якім, грунтуючыся на комплексным крытэрыі перыядызацыі, правамерна вылучыць тры асноўныя этапы: першы – 1795–1864, другі – 1865–1904, трэці – 1905–1917 гг., характэрнымі асаблівасцямі якіх з'яўляюцца цэнзурная залежнасць, колькасныя і якасныя змены ў развіцці кнігавыдавецтваў і складзе іх прадукцыі.

3. Асноўнымі тыпамі кнігавыдавецтваў у Мінску былі прыватныя, грамадскія і дзяржаўныя, кожны з якіх вызначаўся сваёй структурай. Вылучаюцца як універсальныя, так і спецыялізаваныя прадпрыемствы па выданні мастацкай літаратуры, медыцынскай, сельскагаспадарчай, а таксама вучэбнай.

4. Кнігавыдавецкія сувязі Мінска з Вільняй, Варшавай і Пецярбургам, вызначаныя на міжрэгіянальным, культурным (культурная дамінанта пэўнага цэнтра), камунікацыйным (кнігавыдавецкае супрацоўніцтва), колькасна-якасным (кніжная прадукцыя) узроўнях, былі абумоўлены гісторыка-эканамічным і нацыянальна-культурным узаемадзеяннем, праяўляліся ў супрацьстаянні цэнзурнаму ўціску і спрыялі распаўсюджанню асветы.

5. Комплексны аналіз дынамікі развіцця галінова-тэматычнага, відавога і моўна-аўтарскага складу кнігавыдавецкай прадукцыі Мінска дазваляе адзначыць іх універсальны і поліфункцыянальны характар, разнамоўнасць. Аднак на розных этапах мінскага кнігавыдання вылучаюцца і пэўныя колькасныя галіновыя, відавыя і моўна-аўтарскія прыярытэты. Асноўнымі функцыямі, якія былі ўласцівыя мінскім выданням, з'яўляліся агульнакультурная, асветніцкая, выхаваўчая, геданічная, пазнавальная, упраўленчая. Спецыфікай мінскай кніжнай прадукцыі з'яўляюцца дамінуючае становішча краязнаўчай тэматыкі, рускамоўная дамінанта і вядучае становішча мясцовых аўтараў – пісьменнікаў і педагогаў.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Асабісты ўклад суіскальніка заключаецца ў навуковым асэнсаванні стану кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску ў 1795–1917 гг., якая з'яўлялася адным з важных фактараў развіцця культуры і асветы горада, адлюстраваннем грамадскіх і сацыяльных працэсаў, якія адбываліся ў той час; у вызначэнні ролі кнігі ў галіне асветы і наогул грамадства; у распрацоўцы комплекснага крытэрыя перыядызацыі кнігавыдавецкай дзейнасці пры вызначэнні этапаў мінскага кнігавыдання; у выяўленні агульных тэндэнцый і спецыфікі мінскага кнігавыдання; у вызначэнні кнігавыдавецкіх сувязей; у абгрунтаванні тыпалагічнага складу мінскіх выданняў; у тэрміналагічным размежаванні паняццяў "кнігадрукаванне" і "кнігавыданне", а таксама складанні бібліяграфічнага паказальніка мінскіх выданняў (3125 бібліяграфічных запісаў) і, тым самым, увядзенні ў навуковы ўжытак невядомых кніжных выданняў (425 найменняў).

Дадзенае дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца вынікам асабістых навуковых пошукаў у архіўных і бібліятэчных зборах Беларусі (Мінск, Гродна, Полацк), Літвы (Вільнюс), Польшчы (Варшава, Кракаў), Расіі (Санкт-Пецярбург).

**Апрабацыя вынікаў даследавання**

Вынікі і асноўныя палажэнні даследавання былі выкладзены ў дакладах на навуковых канферэнцыях, чытаннях, кангрэсах, сімпозіумах: "Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць" (Мінск, 1996); "Гістарычная памяць народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII – XX стст." (Гродна, 1996); "Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць" (Мінск, 1996); "480 год беларускага кнігадрукавання" (Полацк, 1997); "Гістарычныя кнігазборы Беларусі"

(Мінск, 1997); "Перспектыўныя накірункі навуковых даследаванняў у фарміраванні духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў" (Мінск, 1998); "Першыя Кнігазнаўчыя чытанні" (Мінск, 1998); IV, V, VI, VII, VIII Міжнародныя навуковыя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 1998; Мінск, 1999; Мінск, 2000; Мінск 2001; Мінск, 2002); Трэці міжнародны кангрэс беларусістаў "Беларуская і сусветная супольнасць: узаемадзеянне і ўзаемаўзбагачэннне культур (Да 2000-годдзя хрысціянства)" (Мінск, 2000), Другія Кнігазнаўчыя чытанні "Кніжная культура Рэчы Паспалітай" (Мінск, 2000); "Гісторыя выдавецкай справы ў Беларусі і Польшчы: XVI–XX стст." (Мінск, 2002); Міжнародны сімпозіум пад эгідай ЮНЕСКА "Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі" (Мінск, 2002); Трэція Кнігазнаўчыя чытанні "Кніга Беларусі: повязь часоў" (Мінск, 2003).

**Апублікаванасць вынікаў**

Па праблеме і выніках даследавання апублікаваны 23 навуковыя артыкулы: 4 – у навуковых часопісах, 6 – у навуковых зборніках, 11 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый, 2 – у зборніках тэзісаў дакладаў. Агульны аб'ём публікацый складае 125 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя ўключае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, дзве главы, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц, дадаткі. Поўны аб'ём дысертацыі складае 99 старонак, 255 старонак займаюць дадаткі. Спіс выкарыстаных крыніц змяшчае 522 назвы на беларускай, рускай, украінскай, польскай, нямецкай, лацінскай, англійскай мовах.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** удакладняюцца такія агульныя паняцці кнігазнаўства, як "кнігавыданне" і "кнігадрукаванне", разглядаюцца іх змест і аб'ём, узаемасувязі і суадносіны. Тэрміналагічнае размежаванне названых паняццяў садзейнічала ўдакладненню тэмы даследавання.

У **агульнай характарыстыцы работы** разглядаюцца актуальнасць тэмы даследавання, сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, ставяцца мэты і задачы даследавання, вызначаюцца аб'ект і прадмет, навуковая гіпотэза, метадалогія і метады правядзення даследавання, адзначаюцца навуковая навізна, практычная і сацыяльна-эканамічная значнасць атрыманых вынікаў, вылучаюцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, адзначаецца асабісты ўклад суіскальніка, паказваюцца апрабацыя і апублікаванасць вынікаў даследавання, структура і аб'ём дысертацыі.

У першай главе ***"Узнікненне, станаўленне і развіццё кнігавыдання ў Мінску"*** даецца агляд літаратуры па тэме даследавання, разглядаюцца пытанні зараджэння, станаўлення і развіцця кнігавыдання ў Мінску, яго асноўныя этапы ў 1795–1917 гг., аналізуецца дзейнасць мінскіх прыватных, грамадскіх і дзяржаўных выдавецтваў, вылучаюцца кнігавыдавецкія сувязі Мінска з Вільняй, Варшавай і Пецярбургам.

У першым раздзеле *"Аналітычны агляд літаратуры па тэме даследавання"* пададзены агляд літаратурных, бібліяграфічных і архіўных крыніц, які сведчыць аб нераспрацаванасці тэмы; пацвярджаецца неабходнасць яе даследавання.

Другі раздзел – *"Перыядызацыя мінскага кнігавыдання"*. У мінскім дарэвалюцыйным кнігавыданні правамерна вылучыць два асноўныя перыяды: зараджэння кнігавыдання (XVII–XVIII стст.), станаўлення і развіцця (1795–1917). Прэтэндэнтамі на ролю пачынальнікаў мінскага кнігадрукавання з'яўляюцца: друкарня пры Свята-Духавым мужчынскім манастыры і друкарня праваслаўнага брацтва пры царкве Святых Пятра і Паўла (20 – 30-я гады XVII ст.), а таксама перасоўная друкарня іераманаха Паўла Дамжыва-Лютковіча, сярод выданняў якога ёсць "Казанне" на смерць Аляксандра Фёдаравіча Шаптыцкага" (1622) – адзіны вядомы твор XVII ст., надрукаваны ў Мінску. Бóльшая фактаграфічная забяспечанасць тэмы кнігавыдавецкай дзейнасці ордэна базыльянаў XVIII ст. (вядомы 22 мінскія выданні) дазваляе зрабіць вывад аб узрастаючай ролі кнігавыдання ў горадзе, выкліканага патрэбамі ў галіне дзяржаўнага кіравання, асветы і рэлігіі.



Самае значнае развіццё мінскага кнігавыдання ў дарэвалюцыйны час прыпадае на 1795–1917 гг. Дадзены гістарычны перыяд з'яўляецца складаным як з пункту гледжання сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця, так і з пункту гледжання развіцця цывілізацыйнага сінтэзу "Усход–Захад". Для вылучэння і характарыстыкі пэўных этапаў развіцця мінскай кнігавыдавецкай дзейнасці ў азначаны перыяд быў распрацаваны комплексны крытэрый, у склад якога ўвайшлі галоўны, асноўныя і спецыфічныя крытэрыі. Галоўны крытэрый – гістарычны – звязаны з вылучэннем перыяду 1795–1917 гг. у гісторыі Беларусі і развіцці яе культуры як гістарычнага перыяду Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Асноўныя крытэрыі – сацыяльна-эканамічны, палітычны і культурна-асветніцкі. Прымяненне сацыяльна-эканамічнага крытэрыя дазваляе паказаць рост насельніцтва і яго склад у Мінску, развіццё прамысловасці і эканомікі ад мяшчанска-купецкай да капіталістычнай, пераўтварэнне Мінска ў вядучы гандлёва-прамысловы і банкаўскі цэнтр; палітычнага – уплыў рэвалюцыйных і ваенных падзей 1830-х гг., 1863–1864 гг., 1870–1880-х гг., 1905–1907 гг., 1914–1917 гг.; культурна-асветніцкага – аб стане і развіцці культурна-асветніцкіх, адукацыйных устаноў і нацыянальна-этнічных супольнасцей у горадзе, якія ўплывалі на патрэбы чытацкай аўдыторыі. Спецыфічныя (кнігавыдавецкія) крытэрыі – гэта крытэрыі, якія дазваляюць непасрэдна разгледзець дзяржаўную палітыку ў галіне друку, структуру кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў, функцыянальныя асаблівасці і тэматыку кнігавыдавецкага рэпертуару, характэрныя асаблівасці кнігавыдання. У выніку выкарыстання комплекснага крытэрыя былі вылучаны тры этапы мінскага кнігавыдання: першы – 1795–1864, другі – 1865–1904, трэці – 1905–1917 гг. Характэрнымі асаблівасцямі кожнага з этапаў з'яўляюцца цэнзурная залежнасць, колькасныя і якасныя змены ў развіцці кнігавыдання, кніжнай прадукцыі.

На першым этапе рэформа друку і кніжнай справы, якая пачала ажыццяўляцца ў пачатку XIX ст., спрыяла зараджэнню і развіццю прыватнага і дзяржаўнага кнігавыдання. За гэты час было выдадзена 209 найменняў кніжнай прадукцыі: з іх 143 – на польскай, 27 – на рускай, 16 – на латыні, 4 – на беларускай і польскай, 2 – на нямецкай. 27% з іх складалі рэлігійныя выданні, 25% – выданні па мастацтве, 14% – выданні мастацкай літаратуры, 9,5% – па гісторыі. Відавы склад уключаў у асноўным рэлігійныя (27%), выданні для вольнага часу (24%), літаратурна-мастацкія (13,4%) і вучэбныя (10,5%) выданні. У 1795–1864 гг. прыватныя прадпрыемствы былі асноўным тыпам кнігавыдавецтваў (79%) і займалі вядучае становішча ў мінскім кнігавыданні. Колькасць выдадзенай імі кніжнай прадукцыі склала 68,8%. Поспехі прыватнага кнігадрукавання ў Мінску ў 1850–1860-х гг. засведчылі бóльшую канкурэнтаздольнасць прыватнага друку перад дзяржаўным.

Асноўнымі выдавецкімі прадпрыемствамі ў гэты час былі друкарня Ё. Дворца, літаграфія Э. Адамовіча і Ф. Фалька, кнігарні А. Валіцкага і Бейліных. Кніжная прадукцыя, выдадзеная дзяржаўнымі выдавецтвамі (16%), куды ўваходзілі Мінская губернская друкарня, Мінская гімназія і Мінскі губернскі статыстычны камітэт, склала 28,9%. Мінская губернская друкарня, стаўшы фактычна пераемніцай друкарні ордэна базыльянаў, прадоўжыла ў горадзе кнігадрукаванне. З 1795 г. да 1807 г. яна была адзінай дзеючай у Мінску друкарняй, дзякуючы якой выйшлі ў свет першыя мінскія навуковыя, вучэбныя і літаратурна-мастацкія кнігі. На трэцім месцы быў грамадскі тып выдавецтваў (5%), прадстаўлены Мінскім таварыствам дабрачыннасці, кнігавыдавецкая прадукцыя якога склала 2,3%.

Цэнзурныя абмежаванні 1837, 1864, 1865 гг. паставілі мясцовы друк пад строгі кантроль. У мінскім кнігавыданні ў другой палове 1860 – пачатку 1870-х гг. назіраецца рэзкі спад. З прыватных прадпрыемстваў працавала адна друкарня Ё. Дворца. Новы ўздым мінскага кнігавыдання пачынаецца з апошняй трэці XIX ст., калі ўзрастае і пашыраецца паліграфічная база, узнікаюць новыя друкарні (Б. І. Саламонава, Тасьманаў, Н. М. Нахумава, С. А. Някрасава). У 1865–1904 гг. адбываюцца значныя змены ў мінскім кнігавыданні, звязаныя з развіццём кнігавыдавецтваў грамадскага тыпу (57%). Агульная колькасць выдадзенай імі кніжнай прадукцыі склала 41%. Дамінуючае становішча сярод кнігавыдавецтваў дадзенага тыпу занялі Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі і Таварыства мінскіх урачоў. На другім месцы былі прыватныя выдавецкія прадпрыемствы (24%). Іх кнігавыдавецкая прадукцыя склала 32%. Дзяржаўны тып выдавецтваў займаў трэцяе месца (19%). Кніжныя выданні дзяржаўных прадпрыемстваў у агульным патоку склалі 27%. За 1865–1904 гг. адбыўся значны колькасны рост кніжнай прадукцыі, амаль у шэсць разоў у параўнанні з першым этапам (1181 выд.). Дамінуюць мінскія выданні на рускай мове (1168). Ёсць на польскай мове (12) і лацыні (1). Асноўную тэматыку прадстаўляюць сацыяльна-эканамічныя (33%), сельскагаспадарчыя (15,5%), рэлігійныя (14%) і гістарычныя (7,7%) выданні. Відавы склад адзначаецца ў асноўным афіцыйнымі (63%), рэлігійнымі (14%), даведачнымі (10%) выданнямі.

Трэці этап мінскага кнігавыдання звязаны з заваёвамі свабоды друку (1905). Пачынаючы з 1905 г. у Мінску назіраецца значны колькасны рост кніжных выданняў, якіх за 1905–1917 гг. было выпушчана 1735. Асноўную масу кніжнай прадукцыі складаюць выданні на рускай (1609), яўрэйскай (48), польскай (43), беларускай (18) мовах. Пераважае сацыяльна-эканамічная (50,1%), сельскагаспадарчая (8,2%), рэлігійная (6,7%), медыцынская (6,1%) тэматыка. Відавы склад вызначаецца ў асноўным афіцыйнымі (68,4%), даведачнымі (8,5%), рэлігійнымі (6,7%) і навуковымі (4,6%) выданнямі. Для дадзенага этапа характэрныя найбольшая актывізацыя, далейшае развіццё і канцэнтрацыя прыватнага кнігавыдання (22%) і колькасны рост іх прадукцыі (35,8%). Узнікаюць выдавецкія і кнігагандлёвыя таварыствы ("Культура", "Мінчук", "Вольная Беларусь"). Адпаведна колькасць грамадскіх арганізацый і таварыстваў складае 61%, а выдадзеная імі кніжная прадукцыя – 32,6%; дзяржаўных – 17% і 31,6%.

Размеркаванне прыярытэтаў у выданні кніжнай прадукцыі за перыяд з 1795 г. па 1917 г. паміж прыватнымі (1134 выд.), грамадскімі (1082 выд.) і дзяржаўнымі (932 выд.) выдавецтвамі вызначыла пабудову адпаведнай тыпалагічнай схемы, у аснову якой быў пакладзены лагічны прынцып развіцця формаў уласнасці. Адзначана таксама, што паміж усімі формамі ўласнасці існуе цесная



функцыянальна-сістэмная сувязь. У сваю чаргу кожны з вызначаных тыпаў кнігавыдавецтваў – прыватны, грамадскі, дзяржаўны – мае сваю структуру.

У трэцім раздзеле *"Дзейнасць мінскіх кнігавыдавецтваў"* вылучаецца тыпалагічная структура выдавецкіх прадпрыемстваў, разглядаецца работа асноўных з іх.

Структуру прыватных кнігавыдавецтваў складалі друкарні (літаграфіі, друкалітаграфіі, паравыя і электрадрукалітаграфіі), кнігарні, выдавецтвы газет і часопісаў, аўтары-выдаўцы, выдаўцы-прадпрымальнікі, прыватныя непрафесійныя прадпрыемствы. З ліку прыватных друкарняў аналізуецца дзейнасць кнігавыдавецтваў: І. Лімы і С. Зымеля (1807–1816), З. І. Прэса (1818–1835), І. І. Стафановіча (1819–1850), Г. Э. Бланштэйна (1832–1837), Ё. Дворца (1850–1878), Э. Л. Адамовіча (1855–1874), Б. І. Саламонава (1874–1917), Н. М. Нахумава (1892–1917), С. А. Някрасава (1902–1917), сямейных прадпрыемстваў Дворжацаў (1880–1914), Тасьманаў (1878–1917). Кнігавыдавецкая дзейнасць мінскіх кнігарняў прадстаўлена прадпрыемствамі братоў Бейліных (1855–1859), А. Валіцкага (1859–1863), З. Савіцкай (1863–1894), Я. Філіповіча-Дубовіка (1898–1908), В. Макоўскага (1900–1917). Нязначным у мінскім кнігавыданні быў удзел выдаўцоў газет і часопісаў, выдаўцоў-прадпрымальнікаў, а таксама непрафесійных (невыдавецкіх) прадпрыемстваў (напрыклад, Мінскага камерцыйнага банка). Сярод аўтараў-выдаўцоў асабістых твораў у Мінску вызначылася каля 20 асоб, сярод іх І. Легатовіч, В. Дунін-Марцінкевіч, Л. Шчарбовіч, Ф. Чапялінскі, А. Валіцкі, Д. Бохан, А. Ельскі.

Грамадскія кнігавыдавецтвы Мінска прадстаўлены таварыствамі тыпографаў і выдаўцоў: Мінская польская выдавецкая суполка (1916–1918), таварыства "Мінчук" (1906–1909), "Саха" (1913–1915), "Лучынка" (1914), "Вясёлка" (1915), "Вольная Беларусь" (1917); выдавецтвамі палітычных арганізацый: Беларуская сацыялістычная грамада (1905, 1917), "Звязда" пры Мінскім камітэце РСДРП (1917); культурна-асветніцкіх: "Культура" (1905–1906), Таварыства польскіх вайсковых ведаў (1917–1919); навуковых: Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі (1876–1917), Таварыства Мінскіх урачоў (1867–1914), Мінскі царкоўны гісторыка-археалагічны камітэт (1908–1914); прамысловых, спажывецкіх, крэдытных і страхавых таварыстваў, напрыклад, Мінскае таварыства ўзаемнага крэдыту (1875–1917), Мінскае таварыства ўзаемнага ад агню страхавання (1884–1917); таварыстваў дабрачыннасці, сацыяльнай, медыцынскай дапамогі, напрыклад, Мінскае дабрачыннае таварыства (1811–1915); спартыўных і ахоўных таварыстваў, напрыклад, Мінскае пажарнае таварыства (1889–1907); рэлігійных таварыстваў і ўстаноў: Мінская епархія, чатыры праваслаўныя брацтвы, галоўная і харальная сінагогі, Талмуд-Тора.

Асноўным дзяржаўным выдавецтвам у Мінску была Мінская губернская друкарня (1795–1917). За час сваёй дзейнасці ў ёй было выдадзена больш за 10% ад усёй кніжнай прадукцыі Мінска. Вылучаюцца выдавецтвы ў галіне эканомікі, прамысловасці, статыстыкі і крэдыту, у прыватнасці ў структуры Мінскага губернскага статыстычнага камітэта і Упраўлення Лібава-Роменскай чыгункі; сярод ваенных устаноў – Камітэта Заходняга Фронта Усерасійскага Земскага саюза. Адзначаецца ўдзел у мінскім кнігавыданні і органаў улады (Мінская губернская ўправа па справах земскай гаспадаркі, Мінская губернская ўправа, Мінская губернская дума), устаноў у галіне адукацыі і асветы (Мінская гімназія), суда і

права (Мінскі акружны суд), аховы здароўя і догляду (Мінская яўрэйская бальніца і багадзельня, Мінскі гарадскі санітарны камітэт).

Спецыялізацыя ў кнігавыдавецкай дзейнасці адзначаецца ў рабоце друкалітаграфіі І. Каплана (1898–1917), які супрацоўнічаў з Мінскім таварыствам урачоў і выдаваў у асноўным літаратуру па медыцыне; у працы друкалітаграфіі Я. А. Грынблата (1904–1917), які прадоўжыў традыцыйныя сувязі друкарні Дворжацаў з Мінскім таварыствам сельскай гаспадаркі, вызначыўшыся тым самым у выданні сельскагаспадарчай літаратуры; у друкалітаграфіі Я. Ш. Гатоўскага і М. Х. Юршчыка (1906–1915) – выданне матэматычнай (вучэбнай) літаратуры; у Н. М. Нахумава (1892–1917) – мастацкай літаратуры, вучэбнай філалагічнай на беларускай мове; у Ліўшыца-Баршая (1910–1917) – мастацкай літаратуры на рускай мове; у М. Л. Зысьмана (1910–1913) – мастацкай літаратуры на яўрэйскай мове; у В. Макоўскага (1900–1917) – мастацкай літаратуры на польскай мове.

Чацвёрты раздзел – *"Кнігавыдавецкія сувязі Мінска з цэнтрамі кнігавыдання Расійскай імперыі"*. Цэнтрамі кнігавыдання, на аснове сувязей з якімі аналізавалася іх гісторыка-эканамічная, нацыянальна-культурная і цэнзурная абумоўленасць, выступалі Вільня, Варшава і Пецярбург.

Кнігавыдавецкія сувязі Мінска і Вільні грунтаваліся ў асноўным на прыватных ініцыятывах, якія праявіліся ў дзейнасці такіх віленскіх выдавецтваў і выдаўцоў, як Ю. Завадскі, А. Сыркін, І. Блюмовіч, Э. Навіцкі, "Эдытар", "Зніч", "Наша Ніва", а таксама мінскіх аўтараў і выдаўцоў І. Легатовіча, А. Машыньскага, А. Плуга, С. Фялінскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Ельскага, Д. Бохана, В. Макоўскага, Е. Фрэнкеля, таварыства "Мінчук". На першым этапе (да 1865 г.) характэрны тып кнігавыдавецкіх ўзаемаадносін, якія можна акрэсліць схемай "Вільня → Мінск", дзе Вільня займае пазіцыю цэнтра кнігавыдання ў адносінах да Мінска, праводзіць адбор мясцовых мінскіх матэрыялаў для друку ў Вільні, фінансуе мінска-віленскія наклады. На другім этапе (да 1905 г.) можна вылучыць тып "Мінск → Вільня → Мінск", які вызначаецца тым, што фінансаванне накладаў здзяйсняецца з Мінска, Мінск выступае заказчыкам і атрымлівае гатовую прадукцыю з віленскіх друкарняў. І, нарэшце, у перыяд з 1905 да 1917 г. праяўляецца трэці тып кнігавыдавецкіх сувязей "Мінск → Вільня", асноўнай рысай якога з`яўляецца падтрымка беларускага кнігадрукавання ў Вільні з Мінска як у плане фінансавання, так і арганізацыі беларускага кнігадрукавання ў Мінску.

Паліграфічная база Варшавы, як і Вільні, заставалася на першых пазіцыях у справе кнігавыдання для аўтараў з Мінска. Мінска-варшаўскія кнігавыдавецкія адносіны праявіліся ў шэрагу сумесных праектаў братоў Бейліных і С. Оргельбранда, Ф. Фалька і Г. Натансона, А. Валіцкага і А. Гебетнера, А. Вольфа, У. Ота, З. Савіцкай і Я. Сікорскага, Я. Філіповіча-Дубовіка і А. Каўтза, А. Гебетнера, А. Вольфа, В. Макоўскага і М. Арцта, П. Ляскаўэра, выдавецтва "Культура" і "Выдавецкай друкарні" (Варшава). У рэалізацыі мінска-варшаўскіх кантактаў назіраецца пасрэдніцтва Вільні. Найбольшы ўздым мінска-варшаўскіх сувязей (1917) быў звязаны з дзейнасцю ў Мінску Польскага таварыства вайсковых ведаў. У аснове мінска-варшаўскіх кнігавыдавецкіх сувязей ляжалі нацыянальныя культурныя ініцыятывы: польскія, беларускія, яўрэйскія. Для польскамоўных мінска-варшаўскіх кнігавыдавецкіх узаемасувязей характэрны тып "Мінск → Варшава → Мінск" (наклад і заказ з Мінска). Гэта асноўны тып сувязі, які ўсталёўваецца ў 1800–1864 гг. і адзначаецца ў 1865–1905 гг. З 1905 г. па 1917 г. праяўляецца яшчэ адзін тып кнігавыдавецкіх узаемасувязей – гэта "Варшава → Мінск" (падтрымка польскага кнігавыдання ў Мінску). Беларускамоўныя кнігавыдавецкія сувязі Мінска і Варшавы выглядаюць як "Мінск → Варшава" (беларускамоўныя выданні фінансаваліся з Мінска, друкаваліся ў Варшаве). Яўрэйскамоўныя мінска-варшаўскія выданні адносяцца да тыпу "Мінск → Варшава → Мінск".



Кнігавыдавецкія стасункі паміж Мінскам і Пецярбургам, якія найбольш праявіліся пасля 1864 г. у дзейнасці палітычных арганізацый ( "Чорны перадзел"), студэнцкіх культурна-асветніцкіх арганізацый ("Круг беларускі"), выдавецкіх таварыстваў ("Загляне сонца і ў наша аконца", "Мінчук"), аўтараў і выдаўцоў А. Ельскага, Я. Філіповіча-Дубовіка, Б. Адамовіча, В. Макоўскага, Е. Фрэнкеля, былі накіраваны на самасцвярджэнне беларускай кніжнай культуры, распаўсюджанне і ўплыў дэмакратычнай рускай кніжнай культуры.

Неабходна адзначыць, што, акрамя вылучаных найбольш тыповых кнігавыдавецкіх сувязей Мінска з Вільняй, Варшавай і Пецярбургам, мелі месца таксама стасункі мінскіх кнігавыдаўцоў з Лейпцыгам, Кракавам, Познанню, Кіевам, Смаленскам.

Другая глава ***"Тыпалагічная характарыстыка мінскіх кніжных выданняў"*** прысвечана галінова-тэматычнаму, відавому, моўна-аўтарскаму аналізу выяўленых мінскіх кніжных выданняў; даследаванню асноўных тэндэнцый і спецыфікі ў фарміраванні іх складу.

Першы раздзел – *"Галінова-тэматычны склад мінскіх выданняў"*. Паводле зместу мінскія выданні вызначанага перыяду адносяцца да розных галінаў ведаў: прыродазнаўства, тэхнікі, сельскай гаспадаркі, медыцыны, гісторыі, эканомікі, палітыкі, права, ваеннай справы, адукацыі і педагогікі, бібліятэчнай справы і бібліяграфіі, мовазнаўства, мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства, мастацтва і мастацтвазнаўства, псіхалогіі, філасофіі. Кніжная прадукцыя, выдадзеная ў Мінску, мела свае галінова-тэматычныя прыярытэты.

Найбольш шматлікую групу кніг склалі выданні *сацыяльна-эканамічнай* тэматыкі (1278): па статыстыцы, фінансах, эканоміцы, гарадской і земскай гаспадарцы, грамадскай і дабрачыннай дзейнасці. Выданне сацыяльна-эканамічнай літаратуры ў Мінску, яе змястоўная разнастайнасць сталі прыметай развіцця прамысловасці, эканомікі, гандлю, камерцыі, фінансаў. Значны ўплыў на кнігавыданне названай тэматыкі аказалі Мінская земская ўправа (губернская і павятовая), Мінскі губернскі статыстычны камітэт, Мінскі камерцыйны банк, крэдытныя, ашчадныя, камерцыйныя, страхавыя таварыствы.

Выпуск *рэлігійнай* літаратуры (340), якая займае другое месца ў галінова-тэматычнай структуры мінскіх выданняў, было звязана ў асноўным з дзейнасцю хрысціянскіх канфесій, праваслаўнай і каталіцкай, і ў некаторай ступені – іудзейскай. Найбольш значная колькасць рэлігійных выданняў выйшла па гісторыі царквы і гамілетыцы. Большая частка выданняў – праваслаўная літаратура.

Адным з вядучых кірункаў у мінскім кнігавыданні быў выпуск літаратуры па *сельскай гаспадарцы* (330). Асноўную ролю ў гэтым адыграла Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі. Павелічэнне выдання кніг сельскагаспадарчай тэматыкі было звязана і са значнымі зменамі ў дзяржаўнай палітыцы, рэформай 1861 г., што патрабавала новых падыходаў да землекарыстання, рабіла вострай неабходнасць вывучэння перадавога вопыту ў галіне сельскай гаспадаркі. Найбольш выдавалася літаратуры па агульных пытаннях сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўлі і конегадоўлі, лесаводству.

Мінскія выданні па *медыцыне* (191) асабліва актыўна выходзяць у 1865–1904 гг., калі былі створаны і дзейнічалі Таварыства мінскіх урачоў і Ваенна-санітарнае таварыства. Медыцынскія выданні прадстаўлены шырокім спектрам спецыялізаваных кірункаў, асноўныя з якіх – ахова здароўя, гігіена і санітарыя, эпідэміялогія, інфекцыяністыка, стаматалогія.

У галіне *гісторыі* (177) дамінуюць кнігі па гістарычным краязнаўстве. Тэматыка ўласна гістарычных выданняў прадстаўлена агульнай гісторыяй (сусветнай, гісторыяй Вялікага княства Літоўскага, гісторыяй Расіі) і галіновай гісторыяй (царквы, навучальных устаноў, ваеннай). Нязначная колькасць мінскіх выданняў па археалогіі і этнаграфіі. Выданне гістарычнай літаратуры было звязана з дзейнасцю ў горадзе вучоных, выкладчыкаў-гісторыкаў і краязнаўцаў.

Асноўная частка мінскіх выданняў па *адукацыі* (150) адлюстроўвае дзейнасць органаў кіравання навучаннем у Мінскай губерні, дзейнасць навучальных устаноў і таварыстваў горада. Адсутнасць вышэйшай школы ў Мінску адбілася і на мінскіх выданнях, друк якіх быў падпарадкаваны патрэбам мясцовай сярэдняй школы.

Своеасаблівасцю мінскага кнігавыдання была *мастацкая літаратура* (118), а таксама выданні па *мастацтве і мастацтвазнаўстве* (68), у асноўным мясцовых аўтараў, што пацвярджала статус Мінска як значнага культурна-асветніцкага цэнтра. Мінскія выданні мастацкай літаратуры сведчаць аб развіцці розных яе відаў: прозы, паэзіі, драматургіі. Адной з вядучых тэматык у мастацкай літаратуры была гістарычная. Нотна-музычныя творы 1860-х гг., выдаўцом якіх быў А. Валіцкі, сталі адметнай з'явай як у галіне мінскай выдавецкай справы, так і культуры і мастацтва Беларусі.

Найменш прадстаўленымі ў мінскім кнігавыданні былі такія галінова-тэматычныя групы, як права (84), палітыка (82), тэхніка (77), прыродазнаўства (73), ваенная справа (56), бібліятэчная справа і бібліяграфія (50), мовазнаўства (38), літаратуразнаўства (3), філасофія (2), псіхалогія (2). Асаблівасцю мінскіх выданняў была іх краязнаўчая тэматыка незалежна ад галіны ведаў, якую яны прадстаўлялі.

У другім раздзеле *"Віды мінскіх выданняў па функцыянальным прызначэнні"* робіцца аналіз мінскіх выданняў як прадукта сацыяльнай дзейнасці грамадства, які адлюстроўвае грамадскую ролю, сацыяльнае і мэтавае яго прызначэнне. Грунтуючыся на сучасных навуковых меркаваннях, адзначана, што мінскія выданні з'яўляюцца па сваёй сутнасці поліфункцыянальнымі аб'ектамі. Для іх характэрны шэраг узаемазвязаных сацыяльных функцый. У выніку функцыянальнага аналізу складу мінскіх выданняў па мэтавым прызначэнні былі выяўлены афіцыйныя, навуковыя, навукова-папулярныя, вытворча-практычныя, вучэбныя, масава-палітычныя, даведачныя, выданні для вольнага часу, літаратурна-мастацкія і рэлігійныя.

Самай колькаснай відавой групай мінскай кнігавыдавецкай прадукцыі з'яўляюцца *афіцыйныя* выданні (1953). Іх склад прадстаўлены распарадчымі і выканаўчымі дакументамі. Асноўнымі афіцыйнымі распарадчымі выданнямі былі статуты, загады, законы, інструкцыі; выканаўчымі – справаздачы, журналы, каштарысы, пратаколы. Пераважала сацыяльна-эканамічная, сельскагаспадарчая, медыцынская, адукацыйна-педагагічная, прававая тэматыка. Дамінуючай функцыяй для гэтага віду выданняў была ўпраўленчая. Падфункцыямі вылучаюцца рэгулятыўная, статыстычная і агульнакультурная.

Наступнай колькасна значнай відавой групай былі *рэлігійныя* выданні (340), якія вылучаюцца ў асобную катэгорыю з вызначанымі для іх спецыфічнымі функцыямі: дагматычнай, верапавучальнай, богаслужбовай, багаслоўскай, пасрэдніцкай, свяшчэнна-эмацыянальнай, малітоўнай і іншымі. Функцыі некаторых рэлігійных выданняў могуць супадаць і з пэўнымі функцыямі, характэрнымі для свецкіх выданняў: пазнавальнай, агульнакультурнай, статыстычнай.



Мінскія *даведачныя* выданні (286), прадстаўленыя статыстычнымі аглядамі, памятнымі кніжкамі, каталогамі, даведнікамі, календарамі, бібліяграфічнымі паказальнікамі, слоўнікамі, спісамі, выконвалі ў асноўным статыстычную, а таксама крыніцазнаўчую, агульнакультурную, пазнавальную функцыі.

Асноўную частку мінскіх *навуковых* выданняў (116) утвараюць навукова-даследчыя (манаграфіі, працы, матэрыялы даследаванняў і асобныя даследаванні, даклады) і крыніцазнаўчыя дакументы, якія былі разлічаны на спецыялістаў у галіне медыцыны, сельскай гаспадаркі, прыродазнаўства, гісторыі і адукацыі. У якасці дамінуючай навуковым выданням уласціва пазнавальная функцыя, а таксама крыніцазнаўчая і агульнакультурная.

*Вучэбныя* выданні (113), якія выйшлі ў Мінску, прадстаўлены вучэбна-метадычнымі матэрыяламі для гімназій і вучылішчаў; падручнікамі для пачатковай школы, гімназій і іншых сярэдніх навучальных устаноў; вучэбнымі дапаможнікамі для пачатковага навучання, гімназій, гарадскіх вучылішчаў; падручнікамі для спецыяльнага навучання. Вучэбныя кнігі ў асноўным былі па матэматыцы і мовазнаўстве. Дамінуючай функцыяй выступала пазнавальная, а таксама выхаваўчая і асветніцкая.

У відавой групе мінскіх *літаратурна-мастацкіх* выданняў (109) вылучаюцца навукова-масавыя і масавыя выданні, для якіх характэрна агульнакультурная, а таксама крыніцазнаўчая і геданічная падфункцыі.

Колькасна меншую відавую групу складаюць выданні *для вольнага часу* (86), якія вызначаюцца ў большай ступені геданічнай і выхаваўчай функцыямі; *навукова-папулярныя* выданні (83), прызначэннем якіх было распаўсюджванне навуковых і спецыяльных ведаў сярод шырокага кола грамадскасці, што праяўлялася праз пазнавальную і геданічную функцыі. Новымі для Мінска былі *вытворча-практычныя* (24) і *масава-палітычныя* выданні (20), якія выходзілі на працягу 1865–1904 гг. Вытворча-практычныя выданні прызначаліся спецыялістам па тэхніцы, праве, сельскай гаспадарцы, матэматыцы. Дамінуючай функцыяй тут была пазнавальная. Функцыянальным прызначэннем масава-палітычных выданняў былі прапаганда і асвятленне палітычных і ваенных падзей.

Дамінуючымі функцыямі, якія выконвалі мінскія выданні, на першым этапе былі агульнакультурная, геданічная, пазнавальная, упраўленчая; на другім найбольш праявіліся упраўленчая, агульнакультурная, пазнавальная, на трэцім – упраўленчая, пазнавальная і агульнакультурная.

Трэці раздзел – *"Характарыстыка мінскіх выданняў па моўным і аўтарскім складзе"*. Аналіз кнігавыдавецкага масіву Мінска 1795–1917 гг. па моўнай прымеце пацвярджае вывад аб залежнасці мовы выдання ад дзяржаўнай палітыкі, якая ажыццяўлялася праз пэўныя законы, цыркуляры, палажэнні аб друку. Мова мінскіх выданняў 1795–1864 гг. абгрунтоўвалася шэрагам законаў аб друку, асноўныя з якіх дазвалялі прыватны друк (урадавыя загады 1801 і 1802 гг.); забаранялі яўрэйскае кнігадрукаванне (1837), польскі шрыфт і друк (1864). Паступова праз пасрэдніцтва польскай мовы ўзмацняўся рускамоўны ўплыў на кніжны друк у Мінску. Гэта прасочваецца ў двухмоўных рускіх і польскіх выданнях,

чатырохмоўных (рускіх, польскіх, французскіх, нямецкіх) выданнях, у перакладах з рускай мовы на польскую. Аднак польская мова захоўвалася ў мінскіх выданнях як дамінуючая да 1865 г. Асноўныя пераклады з іншых моў (рускай, французскай) рабіліся на польскую мову. У шэрагу мінскіх рэлігійных выданняў гэтага часу выкарыстоўваліся лацінская і польская мовы. Дзякуючы польскамоўнаму пасрэдніцтву і лацініцы з'яўляюцца першыя мінскія беларускамоўныя выданні і пераклады з польскай на беларускую мову В. Дуніна-Марцінкевіча. Другой дамінуючай мовай у 1795–1864 гг. у мінскім кнігавыданні была руская, трэцяй – іўрыт.

На працягу 1865–1904 гг., калі быў уведзены і дзейнічаў часовы цэнзурны статут (1865), адбылася моўная пераарыентацыя ў кнігавыданні, асноўнай мовай стала руская. Колькасць мінскіх кніжных выданняў на ёй узрасла ў 43 разы ў параўнанні з першым этапам. Павялічыліся пераклады на рускую мову, перапыніліся пераклады на іншыя мовы, эпізадычнымі былі выданні на польскай мове, адзінкавыя – на латыні.

1905–1917 гг. сталі для Мінска гадамі адраджэння разнамоўнага кнігавыдання ў сувязі з дазволам друкаваць на мясцовых мовах (1905). Разам са значным колькасным ростам рускамоўнага кнігавыдання ў Мінску (у 1,4 раза) у гэты час з'яўляюцца пераклады на рускую мову з латыні. На другое месца ў мінскім кнігадруку ў 1905–1917 гг. выходзяць яўрэйскамоўныя (на ідыш), на трэцяе – польскамоўныя выданні. Пачынае развівацца беларускамоўнае кнігавыданне. Пры ўсёй бессістэмнасці і выпадковасці ў выданні кніг на беларускай мове ў Мінску назіраецца і пэўная заканамернасць. Дамінуючае становішча займаюць літаратурна-мастацкія выданні (у 1907–1917 гг.), навукова-папулярныя выданні па сельскай гаспадарцы (у 1914–1915 гг.), масава-палітычныя выданні (у 1917 г.).

Выданне кніг у Мінску на розных мовах залежала не толькі ад цэнзурнага заканадаўства, але і было выклікана патрэбамі грамадскага жыцця. Па-першае, Мінск па складзе свайго насельніцтва з'яўляўся шматнацыянальным полісам. Па-другое, кожная з нацыянальных груп стварала ў горадзе свае нацыянальныя асяродкі культуры, што сведчыла аб захаванні і развіцці ў яго межах нацыянальнай самабытнасці розных народаў. І, нарэшце, з 1905 г., калі разгарнуўся шырокі нацыянальна-вызваленчы рух, мясцовы кнігадрук стаў значным стымулам у развіцці нацыянальных культурных асяродкаў. Адну з вядучых пазіцый у разнамоўным кнігавыданні ў гэты час займаюць вучэбныя і літаратурна-мастацкія выданні.

З развіццём разнамоўных плыняў і ўсталяваннем рускамоўнай дамінанты ў мінскім кнігавыданні асноўныя пазіцыі займалі мясцовыя, мінскія аўтары. Вынікам аналізу аўтарскіх груп стала выяўленая тэндэнцыя колькаснага росту мінскіх аўтараў: у 1795–1864 гг. – каля 40; у 1865–1904 гг. – каля 110; у 1905–1917 гг. – больш за 200 аўтараў. Пашырэнне аўтарскай групы мясцовых аўтараў-спецыялістаў адпавядала стану развіцця пэўнай галіны: сельскай гаспадаркі, медыцыны, эканомікі, права і інш. З развіццём адукацыйнай сеткі ў Мінску адбывалася павелічэнне колькасці мясцовых выданняў для патрэб розных узроўняў адукацыі, пра што сведчаць выданні мінскіх педагогаў па гісторыі, філалогіі, матэматыцы, прыродазнаўстве. Змены ў ваенна-палітычным стане Мінска ў 1914–1917 гг. адбіліся і на яго кнігавыданні: з'явіліся аўтары-палітыкі і вайскоўцы. Значны ўплыў рэлігіі на мінскае грамадства ў 1795–1917 гг. праявіўся ў шэрагу аўтарскіх прац мінскіх святароў і канфесійных дзеячаў, якія займалі адну з вядучых



пазіцый у мінскім кнігавыданні, а ў 1865–1904 гг. гэтая група аўтараў была на першым месцы. Аднак усё ж вядучае становішча на працягу 1795–1917 гг. займалі аўтары – пісьменнікі і педагогі, што яшчэ раз вызначала ролю Мінска як значнага культурна-асветніцкага цэнтра.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Вызначэнне тэрміналагічнага размежавання паняццяў “кнігадрукаванне” і “кнігавыданне”, зробленае на аснове даследавання поглядаў розных кнігазнаўцаў на кожнае з іх на ўзроўні тэорыі, гісторыі і методыкі кнігадрукавання і рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці, дазволіла ўдакладніць тыпізацыю кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў Мінска і выявіць іх структуру [15].

2. Перыяд з 1795 г. да 1917 г. – гэта перыяд станаўлення і развіцця мінскага кнігавыдання. Яго тры асноўныя этапы (1795–1864; 1865–1904; 1905–1917), вызначаныя з дапамогай комплекснага крытэрыя, былі цесна звязаны з важнейшымі працэсамі, што адбываліся ў сацыяльна-эканамічным, палітычным, культурна-асветніцкім жыцці горада. Характэрнымі асаблівасцямі кожнага з этапаў з'яўляецца цэнзурная залежнасць, колькасныя і якасныя змены ў развіцці кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў і іх структуры. Дынамічныя працэсы кнігавыдання ў Мінску сведчаць аб яго актыўнай ролі ў грамадска-культурным жыцці горада [2; 5].

3. Тыпалагічная структура кнігавыдавецтваў Мінска на працягу 1795–1917 гг. прадстаўлена прадпрыемствамі прыватнага (друкарні, кнігарні, выдавецтвы газет і часопісаў, аўтары-выдаўцы ўласных твораў, выдаўцы-прадпрымальнікі, прыватныя непрафесійныя прадпрыемствы), грамадскага (таварыствы выдаўцоў, выдавецтвы палітычных арганізацый, выдавецтвы навуковых таварыстваў, культурна-асветніцкія арганізацыі) і дзяржаўнага характару (прафесійныя прадпрыемствы друку, выдавецтвы ўстаноў у галіне эканомікі, прамысловасці, статыстыкі і крэдыту, выдавецтвы ваенных устаноў, дзяржаўныя органы, установы адукацыі). На першым этапе вядучае становішча займалі прыватныя выдавецтвы, на другім – грамадскія, на трэцім – зноў прыватныя. Дзейнічалі спецыялізаваныя прадпрыемствы па выданні мастацкай літаратуры, медыцынскай, сельскагаспадарчай, а таксама вучэбнай [2; 4; 5, 10; 16; 18; 19; 20; 22; 23].

4. Кнігавыдавецкія сувязі Мінска з Вільняй, Варшавай, Пецярбургам садзейнічалі падтрымцы, развіццю і распаўсюджанню беларускай, польскай, рускай і яўрэйскай кніжнай культуры, адукацыі і асветы. На пэўных гістарычных прамежках часу кнігавыдавецкія сувязі мелі адпаведную накіраванасць у бок аднаго з дамінуючых лакальных цэнтраў. Непасрэдна сувязі ажыццяўляліся праз аўтарска-выдавецкае, выдавецка-друкарскае, выдавецка-кнігагандлёвае ўзаемадзеянне, вынікам якога былі ў большасці выпадкаў сумесныя кніжныя выданні. Выдзеленыя міжрэгіянальны, культурны, камунікацыйны, колькасна-якасны ўзроўні кнігавыдавецкіх сувязей мелі гісторыка-эканамічную і нацыянальна-культурную абумоўленасць [12; 13; 14].

5. У 1795–1917 гг. асноўныя колькасныя галінова-тэматычныя прыярытэты былі за сацыяльна-эканамічнымі, рэлігійнымі, сельскагаспадарчымі і медыцынскімі выданнямі. Асаблівасцю многіх мінскіх выданняў была іх краязнаўчая тэматыка незалежна ад галіны ведаў. Дамінуючае становішча ў відавым складзе мінскіх выданняў па фукцыянальным прызначэнні займалі афіцыйныя і рэлігійныя выданні. Адлюстраваннем сацыяльных патрэб мінскага грамадства былі ў

асноўным даведачныя, навуковыя, вучэбныя і літаратурна-мастацкія выданні, для якіх характэрнымі функцыямі з'яўляліся пазнавальная, агульнакультурная, асветніцкая, выхаваўчая і геданічная [1; 3; 6; 10; 12, 17; 21].

Кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску стала значным стымулам развіцця нацыянальна-этнічных культурных асяродкаў. У цэлым можна адзначыць, што беларускае кнігавыданне складалася з разнамоўных нацыянальных кнігавыдавецкіх плыняў, якія былі цесна звязаны паміж сабой тэматычна і функцыянальна. Нягледзячы на рускамоўную дамінанту ў рэпертуары, кнігавыданне ў Мінску было максімальна набліжаным да мясцовых інтарэсаў, спрыяла развіццю мясцовага аўтарства. Адным са значных дасягненняў мінскага кнігавыдання з'яўляецца пашырэнне аўтарскай групы мясцовых аўтараў-спецыялістаў у розных галінах дзейнасці, што адпавядала стану развіцця пэўнай галіны. Такім чынам, у агульным у перыяд 1795–1917 гг. першынство застаецца за аўтарамі пісьменнікамі і педагогамі, што яшчэ раз пацвярджае ролю Мінска як значнага культурна-асветніцкага цэнтра [2; 4; 9; 17; 18].

У працэсе даследавання быў сабраны вялікі фактычны матэрыял, вынікі аналізу якога пададзены ў дадатках: табліцах ("Тэматыка-відавы склад кніжнай прадукцыі па выдавецтвах"; "Тэматыка-відавы склад кніжнай прадукцыі, выдадзенай на працягу кожнага з трох этапаў"; "Мова мінскіх выданняў"; "Мінскія кнігавыдавецтвы па ўладальніцкай прыналежнасці"); дыяграмах ("Размеркаванне колькасці выдадзенай кніжнай прадукцыі паміж прыватнымі, грамадскімі і дзяржаўнымі выдавецтвамі"); графіку ("Дынаміка выдання кніжнай прадукцыі ў 1795–1917 гг."). Асобным томам дадаецца "Бібліяграфічны паказальнік мінскіх выданняў за 1795–1917 гг."



## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах


1. Доўнар Л. Навучальная кніга для мінчукоў у XIX – пачатку XX стст. // Бібліятэчны свет. – 2003. – № 2 (27). – С.16-18.
2. Доўнар Л. Сорак гадоў з кніжнага жыцця Мінска // Бібліятэчны свет. – 1999. – № 4 (13). – С. 24-25.
3. Доўнар Л. Першая мінская кніга-малютка – урокі паслухмянасці і дабрыні (165 гадоў першаму мінскаму мініяцюрнаму выданню) // Бібліятэчны свет. – 1998. – № 3 (8). – С. 21.
4. Довнар Л. Из истории издательского дела в Белоруссии // Книжное дело. – 1997. – № 1. – С. 71-72.


### Артыкулы ў навуковых зборніках


5. Доўнар Л. І. Выдавецкая справа // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Мн.: БелЭн, 2004. – Т.18, кн.2: Рэспубліка Беларусь. – С. 428-436.
6. Доўнар Л. Не спяшайцеся залічваць да страчанага: мінскія нотныя выданні XIX ст. // Гісторыя выдавецкай дзейнасці ў Польшчы і Беларусі ў XVI – XX стагоддзях: Зб. навук. арт. / НАН Беларусі. ЦНБ імя Я. Коласа; Рэдкал.: Н. Ю. Бярозкіна і інш. – Мн.: Белфранс, 2003. – С. 99-108.
7. Бацяеў В. Ф., Доўнар Л. І. Талмуд // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 321-322; Тое самае: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мн.: БелЭн, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 497.
8. Доўнар Л. І. Мінскія кнігазборы XIX стагоддзя // Здабыткі: Дакум. помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі, Склад. Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына. – Мн., 1998. – Вып. 3. – С. 60-72.
9. Доўнар Л. Крыніцазнаўчая аснова гісторыі яўрэйскага кнігадрукавання XIX ст. у Мінску // Евреи Беларуси: История и культура: Сб. ст. – Мн.: Бестпринт, 1997. – [Вып. 1]. – С. 46-52.
10. Мархель Л. Мінскія выданні ў XIX стагоддзі // Книга в Белоруссии: Книговедение, источники, библиография. – Мн., 1983. – С. 17-28.


### Матэрыялы канферэнцый


11. Доўнар Л.І. Выданне рэлігійных кніг у Мінску ў XIX – пачатку XX ст. // VIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры: Матэрыялы чытанняў (Мінск, 23-26 мая 2002 г.): [У 2 ч.]. – Мн., 2003. – Ч.2. – С.58-67.
12. Доўнар Л. Невядомыя выданні невядомага габрэйскага выдавецтва "Verlag "Kultur" у Мінску (1905–1906): Старонка суіснавання // Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі: Матэрыялы Міжнар. сімпозіума, Мінск, 9-10 ліп. 2002 г.: У 2 кн. / Рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСаЭС "Чарнобыль", 2003. – Кн. 2. – С. 272-280.
13. Доўнар Л. І. Кнігавыдавецкія сувязі Мінска і Варшавы ў канцы XVIII – пачатку XX ст. // Матэрыялы Другіх Кнігазнаўчых чытанняў "Кніжная культура Рэчы Паспалітай" (Мінск, 15-16 верас. 2000 г.) / Нац. б-ка Беларусі; Склад. Т. І. Рошчына. – Мн.: Красіка-Прынт, 2002. – С. 236-243.
14. Доўнар Л. Кнігавыдавецкія сувязі Мінска і Вільні ў XIX – пачатку XX ст. // Гісторыя. Культуралогія. Мастацтвазнаўства: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса

беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывізацый”, 1 сес. – 21-25 мая; 2 сес. – 4-7 снеж. 2000 г., Мінск / Рэдкал.: В. Скалабан (гал. рэд.). – Мн.: “Беларускі кнігазбор”, 2001. – С. 225-233. – (Беларусіка=Albaruthenica; Кн. 21).

15. Доўнар Л. І. Кнігадрукаванне і кнігавыданне. Пункты дотыку і разыходжання // Матэрыялы Першых Кнігазнаўчых чытанняў (Мінск, 15 верас. 1998 г.) / Нац. б-ка Беларусі; Склад. Т. І. Рошчына. – Мн., 2000. – С. 6-9.

16. Доўнар Л. І. Мінскія выданні XIX – пачатку XX стагоддзя ў фондах Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу // Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 22-23 крас. 1998 г.) / Бел. ун-т культуры. – Мн., 2000. – С. 68-74.

17. Доўнар Л. І. Рэдкія мінскія выданні па музыцы XIX ст. // Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі мастацтва і літаратуры: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (24-25 лют. 2000 г.) / Бел. ун-т культуры. – Мн., 2000. – С. 167-170.

18. Доўнар Л. І. Некаторыя аспекты кніжнай культуры Мінска ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя // IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры: Матэрыялы чытанняў (Мінск, 24-26 мая 1998 г.): У 2 ч. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. – Ч. 2. – С. 91-97.

19. Доўнар Л. Праблемы вывучэння мінскай кнігі XIX ст. // 480 год беларускага кнігадрукавання: Матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў (Полацк, 9-10 верас. 1997 г.). – Мн.: Бел. навука, 1998. – С. 232-236. – (Беларусіка=Albaruthenica; Кн. 9).

20. Доўнар Л. Прыватнае кнігадрукаванне Мінска ў XIX стагоддзі // Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 3-4 кастр. 1996 г.). – Мн.: Тэхналогія, 1997. – С. 18-20.

21. Доўнар Л. І. Мінскія выданні XIX стагоддзя па гісторыі // Гістарычная памяць народаў Вялікага Княства Літоўскага і Беларусі, XIII – XX ст.: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Гродна, 3-5 ліп. 1996 г.). – Гродна: Зах.-Бел. гуманітарны цэнтр даследаванняў Усходняй Еўропы, 1996. – С. 370-371. – (Наш радавод; Кн. 7).

Тэзісы дакладаў

22. Доўнар Л. І. Да пытання аб пачатку кнігадрукавання ў Мінску // Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць: Тэз. дакл. на навук. канф. (18-19 крас. 1996 г.). – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1997. – С. 105-106.

23. Самайлюк Т. А., Доўнар Л. І. Праблемы нсдзяржаўнай выдавецкай дзейнасці на Беларусі // Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць: Тэз. дакл. на навук. канф. (18-19 крас. 1996 г.). – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1997. – С. 100-102.



## РЭЗЮМЭ

**Доўнар Ларыса Іосіфаўна**
**Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795–1917): кнігазнаўчы аспект**

Ключавыя словы: кнігазнаўства, гісторыя кнігі, кнігавыдавецкая дзейнасць, перыядызацыя гісторыі кнігі, тыпы кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў, кнігавыдавецкія сувязі, тэматыка кніжнай прадукцыі, віды кніжных выданняў, мова выданняў, аўтары, бібліяграфія.

Аб'ект даследавання – кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску ў 1795–1917 гг.

Прадмет даследавання – развіццё асноўных аб'ектаў і з'яў кнігавыдавецкай дзейнасці: кнігавыдавецтваў, кнігавыдавецкага рэпертуару, кнігавыдавецкіх сувязей, іх тыпізацыя.

Мэта даследавання – вызначыць асноўныя фактары, тэндэнцыі і спецыфіку развіцця мінскага кнігавыдання ў кантэксце грамадска-культурнага жыцця горада.

Навуковая навізна і практычная значнасць.

У дысертацыі ўпершыню даследаваны разнамоўныя кніжныя выданні Мінска з пункту гледжання іх значэння як універсальных крыніц трансляцыі і пераемнасці ведаў і сацыяльна-культурнага вопыту; паказаны асноўныя фактары, тэндэнцыі і спецыфіка развіцця кнігавыдавецкай дзейнасці; дадзена тыпалагічная характарыстыка галінова-тэматычнага, відавога і моўна-аўтарскага складу мінскіх выданняў. У рабоце распрацаваны і прапанаваны комплексны крытэрый перыядызацыі гісторыі кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску, на аснове якога былі абгрунтаваны тры этапы мінскага кнігавыдання: 1795–1864, 1865–1904, 1905–1917. У выніку даследавання кнігавыдавецкай дзейнасці прадпрыемстваў прыватнага, грамадскага і дзяржаўнага характару даны іх тыпалагічная структура, удакладнены гады дзейнасці, а таксама выяўлены новыя выдавецтвы. Даследаваны міжрэгіянальны, культурны, камунікацыйны, колькасна-якасны ўзроўні кнігавыдавецкіх сувязей Мінска з Вільняй, Варшавай і Пецярбургам, вызначаны іх тыпы, якія былі абумоўлены гісторыка-эканамічнымі, нацыянальна-культурнымі кантактамі, супрацьстаялі цэнзурнаму ўціску, спрыялі распаўсюджанню асветы. У працэсе работы над дысертацыяй складзены паказальнік мінскіх выданняў, які ўключае 3125 найменняў, 425 з іх улічаны ўпершыню.

Вынікі даследавання дазваляюць асэнсаваць значэнне захавання кніжнай спадчыны, паўнату ўкладу мясцовых выдаўцоў і аўтараў у развіццё культуры і асветы Беларусі. Работа садзейнічае навуковым гістарычным даследаванням сацыяльна-эканамічнага і культурна-асветніцкага развіцця Мінска. Вынікі даследавання дапаўняюць і ўзбагачаюць беларускую кнігазнаўчую адукацыю, садзейнічаюць павышэнню эфектыўнасці і якасці вучэбных дапаможнікаў і праграм па “Кнігазнаўстве”, “Гісторыі беларускай кнігі” і іншых гісторыка-кніжных дысцыплінах, якія выкладаюцца ў ВНУ Беларусі. Бібліяграфічны паказальнік мінскіх выданняў 1795–1917 гг. з'яўляецца грунтоўным дапаўненнем да рэпертуару кнігі Беларусі.

## РЕЗЮМЕ

**Довнар Лариса Иосифовна**
**Развитие книгоиздательской деятельности в Минске (1795–1917): книговедческий аспект**

Ключевые слова: книговедение, история книги, книгоиздательская деятельность, периодизация истории книги, типы книгоиздательских предприятий, книгоиздательские связи, тематика книжной продукции, виды книжных изданий, язык изданий, авторы, библиография.

Объект исследования – книгоиздательская деятельность Минска в 1795–1917 гг.

Предмет исследования – разитие основных объектов и явлений книгоиздательской деятельности: книгоиздательств, книгоиздательского репертуара, книгоиздательских связей, их типизация.

Цель исследования – показать основные факторы, тенденции и специфику развития минского книгоиздания в контексте общественно-культурной жизни города.

Научная новизна и практическая значимость.

В диссертации впервые исследованы разноязычные книжные издания Минска с точки зрения их значения как универсальных источников трансляции и преемственности знаний и социально-культурного опыта; показаны основные факторы, тенденции и специфика развития книгоиздательской деятельности, дана типологическая характеристика тематико-отраслевого, видового, языкового и авторского состава минских изданий. В работе разработан и предложен комплексный критерий периодизации истории книгоиздательской деятельности в Минске, на основе которого были обоснованы три этапа его книгоиздания: 1795–1864, 1865–1904, 1905–1917. На основе исследования книгоиздательской деятельности предприятий частного, общественного и государственного характера дана их типологическая структура; уточнены годы деятельности; выявлены новые издательства. Исследованы межрегиональный, культурный, коммуникационный и количественно-качественный уровни книгоиздательских связей Минска с Вильно, Варшавой и Петербургом, определены их типы, которые были обусловлены историко-экономическими, национально-культурными контактами, противостояли цензурным ограничениям, содействовали распространению просвещения. В процессе работы над диссертацией составлен указатель минских изданий, включающий 3125 наименований, 425 из них учтены впервые.

Результаты исследования позволяют осмыслить значение сохранения книжного наследия, полноту вклада местных издателей в развитие культуры и просвещения Беларуси. Работа содействует научным историческим исследованиям социально-экономического и культурно-просветительского развития Минска. Результаты исследования способствуют обогащению белорусского книговедческого образования, повышению эффективности и качества учебных пособий и программ по "Книговедению", "Истории белорусской книги" и другим историко-книжным дисциплинам, которые преподаются в вузах Беларуси. Библиографический указатель минских изданий 1795–1917 гг. является основательным дополнением к репертуару книги Беларуси.





## RESUME

**Dovnar Larisa Iosifovna**
**Development of Publishing Activities in Minsk at the end (1795–1917): bibliologic aspect**

Key words: bibliology, the history of a book, book publishing, periodical division of the history of a book, types of publishing enterprises, publishing links, subjects of book production, types of book editions (publications), the language of publications, authors, bibliography.

Object of the study: publishing activities in Minsk (1795–1917).

Subject of the study – development of the main aspects and phenomena of publishing activities: publishing houses, publishing repertory, publishing links; their typification.

The aim of the study - to reveal the main factors, tendencies and specific character of the development of Minsk publishing in the context of socio-cultural life of the city.

Scientific novelty and practical significance.

In the dissertation multilingual book publications are first investigated from the point of view of their significance as universal sources for transmitting and continuity of acquired knowledge and socio-cultural experience; main factors, tendencies and specificity of publishing activities are shown; a typological description of subject-branch, functional and language-author's structure of Minsk publications is given. In the study the systematic criterion of periodical division of the history of publishing activities is developed and suggested. On its basis three main periods of Minsk publishing were grounded: 1795–1864, 1865–1904, 1905–1917. On the basis of complex examination of publishing activities of the enterprises of private, public and state character their typological structure is given; the dates of their work are specified; new publishing houses are brought to light. Interregional, cultural, communicational and quantity-qualitative levels of publishing links of Minsk with Vilno, Warsaw and Petersburg are investigated, the types which were stipulated by historical-economic, national-cultural contacts, which resisted the limitations of censorship and contributed to the spreading of enlightenment are defined. In the process of the dissertation study the index of Minsk publications has been compiled. It includes 3125 titles of publications, 425 – are exposed and accounted for the first time.

The results of the investigation allow to comprehend the importance of preservation of book heritage, the contribution of local publishers to the development of culture and enlightenment in Belarus. The work helps scientific historical investigations of social-economic and cultural-enlightening development of Minsk. The results of investigation assist to the enrichment of the belarusian bibliologic education, increase of effectiveness and quality of textbooks and programs for "Bibliology", "History of the Belarusian Book" and other historical – book-learning disciplines, taught at the institutions of higher education of Belarus. The bibliographical index of Minsk publications 1795–1917 is a substantial addition to the book repertory of Belarus.

*Навуковае выданне*

**Доўнар Ларыса Іосіфаўна**

РАЗВІЦЦЁ КНІГАВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
Ў МІНСКУ(1795–1917): КНІГАЗНАЎЧЫ АСПЕКТ

**Аўтарэферат**

**дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук**

Падпісана ў друк 16.03.2005 г. Фармат 60x84 1/16. Папера пісчая № 1.
Ум. друк. арк. 1,29. Ул.-выд. арк. 1,21. Заказ № 100. Тыраж 60 экз.

Рызограф УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17